Наш культурны асяродак
# Жырандоля
*Выпуск № 10 (452)*



Сугучча

## На мове творчасці, або Прычым тут ружовы слон?

**У красавіку міжнародны тэатральны праект HomoCosmos прадставіць у Мінску прэм'еру спектакля «Убачыць ружовага слана», працаваць над якім запрасілі эстонскага рэжысёра, прадзюсара і тэатральнага педагога Калева Куду. Таксама ў інтэрнацыянальную каманду ўвайшлі перакладчык з Эстоніі, беларускі харэограф Сяргей Паяркаў і ўладальніца прэміі «Найлепшы сцэнограф года», мастак-пастаноўшчык Кацярына Шымановіч, прадзюсар Кацярына Саладуха і шэраг айчынных акцёраў — Анастасія Баброва з Тэатра беларускай драматургіі, купалавец Іван Трус, акцёры тэатра і кіно Кацярына Бондарава і Дзмітрый Ягораў. У выніку атрымаўся спектакль пра адзіноту і пошукі паратунку ў «кампаніі» дарагога алкаголю — і ўсё адно, як сцвярджае рэжысёр, гэта гісторыя пра каханне.**


polygon.ee.

**Сцэна з пастаноўкі «Убачыць ружовага слана» 2013 года ў PolygonTeater.**

П'еса сучаснага эстонскага драматурга Пірэт Яакс «Убачыць ружовага слана» ў 2011 годзе атрымала галоўную прэмію конкурсу Эстонскага тэатральнага агенцтва і пазней перакладзена на 7 моў свету, у тым ліку рускую. Але сцэнічнае ўвасабленне атрымала ўсяго аднойчы, якраз у Эстоніі — і, як прызнаецца **рэжысёр Калев Куду,** гэта версія яму не спадабалася. «Спадзяюся, тая гісторыя, якая атрымліваецца ў нас цяпер, атрымаецца значна глыбейшай. Наш галоўны герой — не злы і не добры, я наогул не люблю гэтыя азначэнні ў тэатры; ён амбівалентны персанаж, у якім кожны ўбачыць нешта сваё. Дэталі сюжэту раскрываць не буду, але гаворка ідзе пра паступовую дэградацыю асобы, адыход у сябе. Што да ружовага слана, то ён не выпадковы — гэта метафара часта выкарыстоўваецца, калі гаворка ідзе пра алкагольныя ілюзіі...»

Наогул праект HomoCosmos, ініцыяваны прадзюсарамі з Беларусі і Польшчы, стартаваў 2,5 года таму і з самага пачатку абраў цэнтральнай тэмай сваёй работы чалавека, ягонае цела і цялеснасць, пошук сябе ў свеце. Кожная з мінулых пастановак праекта — «Камера, якую дала мне маці», «Бог казытання», «Дора, або сексуальныя неўрозы нашых бацькоў», «Раскрыццё» — мела востры сацыяльны падтэкст і выклікала гарачыя дыскусіі. **Прадзюсар Кацярына Саладуха** спадзяецца, што спектакль «Убачыць ружовага слана» таксама атрымае рэзананс у грамадстве, і анансуе будучыя планы: «Наш тэатральны праект пяройдзе на новую сцэнічную прастору HIDE і ператворыцца ў тэатральны цэнтр з пастаяннай пляцоўкай, а значыць, атрымае больш магчымасцяў для развіцця».

— Мы вельмі ўсцешаныя, што такія праекты нараджаюцца, асабліва прыемна, што ініцыятыва ідзе не «зверху», ад пасольства, а «знізу», ад саміх прафесіяналаў творчай сферы, — адзначае **прадстаўнік пасольства Эстоніі ў Беларусі Вівіян Саарперэ.** — І мы, са свайго боку, безумоўна зробім усё належнае для падтрымкі і паглыблення культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры паміж Беларуссю і Эстоніяй дзейнічае з 2004 года і прыносіць плён у выглядзе штогадовых абменаў тэатральнымі і музычнымі гастролямі, узаемнымі мастацкімі выстаўкамі, удзелам у творчых конкурсах і кінафестывалях. У прыватнасці, сёлета плануецца паказаць фільмы эстонскіх рэжысёраў для дзяцей і моладзі ў сталічным кінатэатры «Піянер», прывезці фотавыстаўку экс-прэзідэнта Эстоніі Ленарта Меры і паўтарыць выстаўку, прысвечаную расійскім стараверам і іх святым мясцінам (гэта экспазіцыя некалькі гадоў таму ўжо была паказана ў Беларусі і мела вялікі поспех). Летам другі раз у Верхнім горадзе пройдзе свята культуры Эстоніі, якое, паводле слоў кіраўніка эстонскай дыяспары Олівера Манглуса, збярэ каля 250 творчых удзельнікаў. У сваю чаргу, хутка наша краіна прадставіць у Эстоніі мастацкі праект, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, а салістка беларускага Вялікага тэатра Маргарыта Ляўчук выканае галоўную партыю ў оперы «Мантэкі і Капулеці» ў эстонскім горадзе Пярну.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Крыніца натхнення

# ПА ГРЭСКУ БАСАНОЖ...

**З народнай артысткай Беларусі Вольгай КЛЕБАНОВІЧ, артысткай тэатра імя Максіма Горкага, нават незнаёмцы на вуліцах вітаюцца. І бабулі ў двары, дзе яна жыве. Гэта актрыса, здольная пераўвасабляцца як у жанчын з народа, так і ў лэдзі. Сярод шматлікіх яе роляў, а іх за пяцьдзясят гадоў служэння тэатру набралася больш за сотню, цяжка знайсці «прахадную». Апроч яркага тэмпераменту, адкрытасці, сілы пачуццяў, гнуткага розуму і жаноцкасці харызматычнай актрысе таксама ўласціва тая самая метафізічная душэўнасць. Пытаюся ў яе: «Адкуль душэўнасць?» А Вольга адказвае: «Сіла мая адтуль, дзе прайшло дзяцінства».**

— Мястэчка Грэск, што пад Слуцкам, дзе я расла ў бабулі і дзядулі аж да восьмага класа, у маім сэрцы жыве і па сённяшні дзень. Бацькі ў вайну не стала, а мама ў той час падымала Мінск з руін. Калі ў мяне пытаюцца, што больш за ўсё запомнілася з тае пары, адказваю: жыццё наросхрыст, жыццё басанож... А гэта значыць — з адкрытасцю пачуццяў, расхінутасцю сэрца. Бо я — дзіця лугоў, палеткаў і рэк. А што як не прырода спрыяе яго абуджэнню. І памяць пра тое месца, дзе ты быў, калі адчуў рух душы, да канца маіх дзён будзе жыць ува мне. Там я ўдыхала водары разнатраўя, на кані ездзіла ў начное, на лыжах уцякала ад ваўкоў... Гэтая памяць напаўняе мяне цяплом, саграваe ў хвіліны душэўнага холаду. Ён таксама здараецца. І тады ў думках я адпраўляюся ў Грэск. Успамінаю, як на партфелі з'язджала з гары, як са стрыечнай сястрой праз плыткую рэчку ў школу бегалі ўброд. Аднойчы, калі вясной рака разлілася, і мы чагосьці не ўлічылі, пераходзячы яе, заявіліся да хаты ў мокрых кажухах...

— Я — рамантык, летуценнік. Адкуль гэта ўва мне? Ды ўсё адтуль жа! Ад энергіі зямлі... Мне заўсёды здавалася, што і я цягнуся ў неба разам з ёй. Таму з ранніх гадоў жыву з адчуваннем палёту. І ўвесь час яго прадчуваю. У дзяцінстве хацела стаць лётчыцай...

— Малая радзіма — гэта босыя ногі ў цёплым пяску, сяброўкі, з якімі смяешся на прызбе, хрумкаеш яблыкамі, альбо ўплятаеш лусту, і птушкі з іх вясновымі пошчакамі, і зорнае неба, да якога, здавалася, можна рукой дацягнуцца... І моцны сон, у які правальваешся імгненна, нягледзячы на гарачае жаданне — не спаць, каб усю ноч слухаць салаўёў.

— Там і знак мне быў. Толькі гэта я праз гады зразумела, калі да мяне як да актрысы прыйшоў поспех. У момант авацый гледачоў пасля паспяховага спектакля на імгненне адчула, як прыўздымаюся над падмосткамі сцэны. І тады ўспомніла, што ўжо ведаю такі стан палёту.

— На зямлі маёй малой радзімы перажыла містычныя пачуцці. Гэта быў сон і не сон адначасова. Яго можна назваць станам, папярэднім сну. Грэск, гарачы летні дзень, на лузе непадалёк ад нівы з жытам каровы пасуцца... Мне гадоў 14—15... Прысела на краі нівы і не заўважыла, як задрамала. Але адчуванне жыцця побач не пакідала: гулі пчолы, цвыркалі конікі, спявалі жаўрукі ды кнігаўкі. Частка маёй свядомасці не спала. І раптам бачу, як на мяне з неба падае велізарная зорка, яна ззяе ды пераліваецца жоўтым колерам. Ну, усё, згару, падумала я, але страху не было: думка паўстала імгнлётная. Адчула, як блакітна-залатыя промні гэтай зоркі мяне ахутваюць, абмываюць, а потым невядомая сіла прыўздымае ўвысь над зямлёй. Вакол ззянне, і я адчуваю велізарнае, ні з чым не параўнальнае шчасце. Што гэта было? Бласлаўленне Нябёсаў на будучую прафесію, знак? Цяжка сказаць. Але ў юнацтве я, акрамя таго, што хацела стаць і хірургам, раптам стала думаць пра тое, што буду артысткай...

— Нядаўна запісвалася на радыё. Спявала беларускія песні, распавядала пра сваю малую радзіму. І нібы там пабывала. Пасля запісу да вечара адчувала велізарны прыліў сіл. Вось што такое нават успаміны пра яе. У сувязі з гэтым скажу: мінулае нікуды не знікае. Яно, як у банку даных, існуе ў велізарным энергаінфармацыйным полі. Варта толькі накіраваць сваю свядомасць туды, куды табе трэба, і ты ўжо там.



— Народныя песні ведаю, многія выконваю з нагоды. Вось як на радыё прыйшлося. А спяваю з дзяцінства. Як казалі родныя, дзядуля з бабуляй, суседзі, настаўнікі: добра спяваю, прадказвалі мне кар'еру салісткі, раілі паступаць у кансерваторыю. Але я пайшла на акцёрскае аддзяленне тэатральна-мастацкага інстытута.

— Мне добра знаёмыя характары простых беларусак. Я назірала іх у дзяцінстве, жывучы ў Грэску. Можа быць, таму мне ўдаліся ролі жанчын з народа. Гэта і Марыля ў спектаклі «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы, і Жанчына ў «Вяртанні ў Хатынь» Алеся Адамовіча, і Сцепаніда ў «Знаку бяды» Васіля Быкава. Гэта вехі маёй творчасці. Дарэчы, для беларускіх жанчын характэрная душэўнасць. Яна выяўляецца ва ўменні слухаць і чуць іншага чалавека, не выяўляць актыўнасць, іншымі словамі — не нападаць на суразмоўніка. У іх унутры вяршыцца жыццё, а вонкава яны могуць быць стрыманымі, могуць падацца нават абыякавымі. Але гэта толькі на першы погляд.

— З дзіцячых гадоў люблю людзей, старэйшых за мяне. У Грэску мне падабалася слухаць, як гавораць паміж сабой старыя. Калі пераехала ў Мінск, маёй шчырай сяброўкай была мама. Ад яе я навучылася слухаць і чуць людзей. Калі прыйшла ў тэатр, пасябравала з Аляксандрай Іванаўнай Клімавай. І потым мне падабалася сябраваць з дасведчанымі артысткамі, якія былі старэйшыя за мяне. Іх мудрасць прыцягвала, як магніт. Магчыма мае сялянскія гены арыентавалі мяне на такія зносіны. Бо я дзяўчына з народа. І добра ведаю: мудрасць пажылых людзей — бясцэнны скарб. Гэта разумеюць тыя, хто хоча ў жыцці развівацца. І вучыцца на чужым вопыце. А разумны душэўны чалавек, ён і ў старасці не ачарсцвее. Таму і маладым людзям будзе цікавы.

— Магчыма, і сапраўды нашы здольнасці прама прапарцыйныя душэўнасці. А дзе яе месца, хто дакладна ведае. Але мне ў гэтай сувязі падабаецца выказванне нямецкага філосафа-рамантыка Навaліса. Паводле яго слоў, месца душы там, дзе судакранаюцца знешні ды ўнутраны светы, дзе яны пранікаюць як сябар у сябра. Яно — у кожным пункце іх пранікнення. У гэтым сэнсе мая малая радзіма для мяне і з'яўляецца гэтым пунктам.

**Валянціна ЖДАНОВІЧ.**

Кінакрокі

# «Сумняваюся, што мае дзеці больш таленавітыя, чым я»

### «Беларусьфільм» прадставіў яшчэ два фільмы, і яны аўтарскія

**Пакуль мы глядзелі і ацэньвалі «Шахцёраў» Віктара Аслюка, «Лебедзяў» Галіны Адамовіч і «Полацкі вальс» Вольгі Дашук, Нацыянальная кінастудыя завяршала работу над яшчэ двума дакументальнымі фільмамі. Гэтым разам у цэнтры ўвагі дзвюх рэжысёрак — Наталлі Жамойдзік і зноў жа Галіны Адамовіч — аказаліся сям'я, што ўсынавіла дзіця, і Веньямін Бычкоўскі з вёскі Бабровічы з яго незвычайнымі памкненнямі і поглядам на жыццё.**



**Кадр з фільма «Вядо».**

«На «Беларусьфільме» стала зашмат дэмакратыі», — сказаў прадстаўнік кінастудыі, і сапраўды бачна, у прыватнасці ў дачыненні да дакументальнага кіно, што тут стала больш прасторы. У параўнанні з папярэднімі, не вельмі прадукцыйнымі мінулымі гадамі, студыя неігравога кіно «Летапіс» паспела заняцца і аўтарскімі праектамі (з пераменным поспехам), і тэлевізійным лікбезам, і ў меншай ступені афіцыйнымі заказамі.

Два новыя фільмы — аўтарскія, то-бок створаныя па прапанаваных рэжысёрамі тэмах, што яшчэ раз паказвае, быццам жорсткае дыктаванне ўмоў засталося ў мінулым. Гэта далёка не значыць вырашэнне ўсіх праблем, але паказвае, што некаторыя зрухі да лепшага магчымыя і залежаць яны, напэўна, ад асобы (асоб?).

Невядома, у якіх умовах, з якім бюджэтам і за колькі здымачных дзён стваралася «Адна сям'я» Наталлі Жамойдзік, бо гэта застаецца «балючым пытаннем» кінастудыі, але ж і творчая задача ў гэтым выпадку на вялікія абшары не разлічвала. Аўтары пачалі аповед ад моманту, калі сям'я забрала хлопчыка з дзіцячага дома і крыху пажылі з іх новым уладкаваннем.

Новыя клопаты для бацькоў, новае жыццё для хлопчыка, школа, наведванне брата і сястры ў іншых сем'ях, размова з псіхолагам — гледачу літаральна паведамілі, што некаторыя сем'і ўсынаўляюць дзяцей. Сорак хвілін на інфармацыю, проста-павярхоўнасць, фіксацыю наваколля, толькі дакументальнае кіно здольнае на большае — на ўсе магчымыя тупікі, супярэчнасці і глыбіні жыцця.

Затое «Адна сям'я» адыграла сваю дакументальнасць напоўніцу: усе размовы быццам схопленыя камерай, калі трэба агучыць новыя сямейныя абставіны — калі ласка псіхолаг і візіты да такіх жа прыёмных сямей.

Карціна «Вядо» па назве возера і мясцін, у якіх жыве галоўны герой, больш разнагалосая, супярэчлівая і візуальна прывабная, ды пад «Троіцу», але часам штучная. Веньямін Бычкоўскі ў свой час з Расіі пераехаў у беларускую вёску, пачаў збіраць артэфакты, што выносяцца пяском (калекцыя ўражвае), пабудаваў капліцу, тым часам ажаніўся і займеў двух сыноў.

Галіна Адамовіч за цікавым персанажам убачыла сямейную драму і змагла раскруціць тэму ў часам кур'ёзнае рэчышча. Мы бачым Веньяміна, а таксама яго жонку, у момант, калі яны ўжо не жывуць разам, і маем магчымасць пачуць поўныя асабістых пачуццяў прыязныя аповеды аб адным і тым жа. Мантаж дапамагае падкрэсліць супрацьлегласць, рознасць персанажаў выклікае ўсмешку, іх аповеды прымушаюць вагацца паміж дзвюма пазіцыямі. Карацей, такое неадназначнае жыццё.

Стаўленне да выхавання дзяцей мае выклікаць найбольшы ўнутраны канфлікт гледача. «Сумняваюся, што мае дзеці стануць больш разумнымі і таленавітымі, чым я», — кажа галоўны герой, які быццам павінен ацаніць, ці вартыя яны яго бацькоўскай любові. Маляўнічыя краявіды, нечаканая магія месца ды пастановачныя эпізоды з Веньямінам каля сваёй капліцы прынамсі маюць справу з тымі самымі супярэчнасцямі жыцця, заўважыць якія нам выпадае не заўсёды.

Зараз «Летапіс» займаецца адразу некалькімі праектамі, сярод якіх і работы маладых аўтараў — навічкоў на кінастудыі, і нашых мэтраў, што ставяць свой талент і досвед супраць неспрыяльных акалічнасцяў кінастудыі. Больш за тое, наступны альманах — на «Беларусьфільме» было створана ўжо два альманахі маладых аўтараў — збірае дакументалістаў. Новыя фільмы будуць прадстаўлены па выніках года.

На экранах

## Распад сям'і з пазіцыі чалавека на татамі

### У сталіцы будзе паказана шэсць фільмаў японскага класіка

**Шчымлівы Ясудзіра Одзу — 2 красавіка ў мінскім «Піянеры» распачнецца ўжо восьмая рэтраспектыва японскага кіно, якая штогадова арганізуецца «АРТ Карпарэйшн» з удзелам пасольства Японіі і кампаніі JTI. У мінулыя гады беларускія гледачы глядзелі японскага Шарло — Тора-сана, падборку карцін у традыцыйным жанры «Кайдан» альбо «новую класіку японскага кіно» — вядучых сучасных аўтараў Японіі, імёны якіх з'яўляюцца ў праграмах найважнейшых сусветных кінафестываляў. Рэтраспектыва гэтага года — беспрэцэдэнтная: на вялікім экране будзе паказана шэсць адрэстаўраваных фільмаў «самага японскага» і аднаго з найкласічных сусветных рэжысёраў.**

Ясудзіра Одзу — гэта непапраўныя адбіткі ў гісторыі кіно і амаль непазбежная прыхільнасць кінааматараў, хоць тут і маралізм, і скупасць на мастацкія сродкі, і традыцыйнасць каштоўнасцяў. Убачыць, напрыклад, павольныя рухі бацькоў, на якіх у дзяцей няма часу, і ўвесь спектр магчымых пачуццяў, якія дакранаюцца да кожнага з нас, дарагога варта.

З «Такійскай аповесці», дарэчы, рэтраспектыва распачнецца. І працягнецца наступнымі разважаннямі аб сямейных праблемах і інстытуце сям'і ў цэлым, бо на працягу ўсёй сваёй творчасці рэжысёр расказваў толькі пра сям'ю і толькі ў адным стане — у стане распаду.



**Кадр з фільма «Позняя восень».**

З вельмі абмежаваным інструментарыем (напрыклад, Одзу амаль заўсёды выкарыстоўваў адзін тып плана — з пазіцыі чалавека, што сядзіць на татамі), але з унікальным спосабам у тым ліку мантажу рэжысёр кожны раз мог заўважыць і выявіць нават больш, чым аўтарская нястрымнасць. Гуманізм, блізкасць да традыцыйнага японскага малюнка і надзвычайная рэалістычнасць герояў — Ясудзіра Одзу са сваім «сапраўдным японскім духам» становіцца абавязковым да прагляду і лепш, калі атрымаецца ўбачыць яго на вялікім экране.

Праграма гэтага года ўключае ў сябе шэсць карцін (у цэлым Одзу стварыў пяцьдзясят тры): чатыры каляровыя і дзве чорна-белыя, атрымаць якія для рэтраспектывы, канешне, падаецца вялікай удачай. «Кветкі свята Хіган», «Добрай раніцы», «Позняя восень», «Смак сайры» і «Смак рысу з зялёнай гарбатай» разгрупуюцца ў кінатэатры «Піянер» з 2 да 7 красавіка.

Фільмы рэтраспектывы будуць прадстаўляць японскі кіназнаўца і кінакрытык Хіраноры Іта, што спецыялізуецца ў прыватнасці на спадчыне Ясудзіра Одзу, і праграмны дырэктар кінафестывалю «Лістапад» Ігар Сукманаў.

Апроч іншага, «Такійская аповесць» будзе паказана асобна і бясплатна для мінчан, што з'яўляюцца наведвальнікамі Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту, а вольны ўваход на любы з паказаў атрымаюць сябры Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў.

Паўсядзённае існаванне, увасобленае ў карцінах Ясудзіра Одзу, як бы гэта ні гучала, можа стаць не зусім звычайным ці нават надзвычайным часам для сённяшняга гледача.

У закрытай прасторы

## МОЦАРТ, МАНЮШКА І БЕНІТА ГАНСАЛЕС ТРЫА

### «Мінская вясна» з яе беларускімі прэм'ерамі ўжо на падыходзе

**Беларуская дзяржаўная філармонія расказала, чым будзе напоўнены юбілейны — трыццаць пяты — Міжнародны фестываль музыкі «Мінская вясна», першы канцэрт якога адбудзецца 3 красавіка. Не такая «пантовая», як іншыя прыклады беларускіх музычных фестываляў з шэрагам спонсараў, прытым і без бюджэтнага фінансавання, але вельмі ўпэўненая ў прасторы класічнай і джазавай музыкі, «Мінская вясна» падрыхтавала надзвычай прывабную праграму, у якую апроч іншага ўвайшлі сусветная прэм'ера новага твора беларускага кампазітара Вольгі Падгайскай і цэлы стос беларускіх прэм'ер.**

Чаго варты «Рэквіем» Вольфганга Амадэя Моцарта ў не так даўно знойдзенай версіі для струннага аркестра, гэта значыць, без духавых інструментаў. У філармоніі кажуць, што «Рэквіем» і без таго заўсёды збірае поўную залу слухачоў. Гэтым разам — у праграме «Толькі Моцарт» з удзелам вядомага піяніста Кірыла Кедука 9 красавіка — у выкананні Дзяржаўнага камернага аркестра адбудзецца беларуская прэм'ера пакуль беларускаму аматару музыкі невядомага прачытання.

Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі будзе задзейнічаны яшчэ ў некалькіх канцэртах «Мінскай вясны». Асаблівую ўвагу прыцягвае важкае сачыненне Іагана Баха «Страсці па Марку» ў рэканструкцыі нямецкага дырыжора Ёрна Бойзена, што на канцэрце ў Мінску сам будзе кіраваць аркестрам. Канцэрт 23 красавіка плануе сабраць на сцэне філармоніі цэлую міжнародную каманду, што з арганізатарскага пункту гледжання і з пункту гледжання супадзення зорак выпадак бяспрыкладны.

Разам з музыкантамі камернага аркестра і салісткамі Вялікага тэатра оперы і балета Таццянай Гаўрылавай і Наталляй Акінінай шэдэўр Баха будуць выконваць тэнар Бенджамін Глаўбіц і бас-барытон Джуліян Рэдлін з Германіі і ансамбль салістаў аркестра Pratum Integrum з Расіі. Па словах арганізатараў, чарговае выкананне «Страсцей па Марку» ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў найбліжэйшай перспектыве малаверагоднае.

Апошні ў гэтым сезоне канцэрт аўтарскага праекта Яўгена Бушкова «Класіка — гэта класна», які ідзе ўжо дзесяць гадоў, пройдзе ў рамках фестывалю 6 красавіка пад назвай «Чароўны... барабан». Тон сустрэчы будуць задаваць ударныя.

«Мінская вясна» не магла не далучыцца да святкавання 200-годдзя з дня нараджэння Станіслава Манюшкі, якое шырока адзначаецца ў Польшчы, Літве, Расіі і, канешне, Беларусі. Гаворка ідзе пра чарговую беларускую прэм'еру: упершыню ў краіне ў канцэрце «Вечар кансерваторыі» 11 красавіка будуць выкананыя Манюшкавы «Крымскія санеты». Выканальнікамі стануць студэнцкі сімфанічны аркестр і студэнцкі хор нашай акадэміі музыкі, а таксама студэнцкі хор Кракаўскай музычнай акадэміі. Дырыжорамі стануць беларус Андрэй Галанаў і госць з Кракава Station Станіслаў Краўчынскі.

Музыка Баха прагучыць таксама ў «Шэдэўрах віяланчэльнага барока» 5 красавіка, дзе выступіць саліст Маскоўскай дзяржаўнай акадэмічнай філармоніі Кірыл Родзін, і на «Вечары музыкі для флейты і клавесіна», які зробяць Галіна Мацюкова і Дзмітрый Зубаў. Нарэшце, музыку вядомых кампазітараў для аргана, у тым ліку Баха, 24 красавіка выканае нідэрландскі арганіст Петэр Аўвэркерк.

«Джазавы вечар у філармоніі» 7 красавіка зробіць Беніта Гансалес трыа з ЗША, якое, апроч уласна Гансалеса, прадстаўляюць Арк Аўруцкі і Дэвід Ходэк.

Апошнім канцэртам фестывалю 26 красавіка філармонія адзначыць 75-годдзе вызвалення краіны ад фашысцкіх захопнікаў. «Вайны, якой яе прынята паказваць, з ваеннымі песнямі і так далей, не будзе. Я б гэты канцэрт нават канцэртам не назвала. Як гэта будзе адбывацца — інтрыга, — кажа Вольга ЯНУМ, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Рыгора Шырмы, што рыхтуе праграму выступлення. — Рэпертуар на 90 працэнтаў — прэм'ерны і вельмі незвычайны. Гэтых сачыненняў тут пакуль не чулі. Апроч нашай капэлы, у канцэрце будуць задзейнічаны выдатныя выканаўцы — тэатр танца «Альтана», які створыць незвычайную атмасферу, цудоўныя салісты віяланчэль—скрыпка—саксафон Аляксей Афанасьеў, Алег Яцына і Павел Казак. Будзе выканана музыка кампазітараў найбліжэйшага замежжа, напрыклад, гордасці Латвіі Петэрыса Васкса і Эрыка Эшэнвалдса. Але галоўнае — тут адбудзецца сусветная прэм'ера беларускага кампазітара Вольгі Падгайскай «Памяці ахвяр Халакосту». Мы самі пад вялікім уражаннем ад твора, гэта будзе вартым завяршэннем фестывалю».

Вольга Янум таксама адзначыла сімвалічнасць даты, калі гэта «дзейства ці перформанс» адбудзецца, бо 26 красавіка — дзень памяці аб чарнобыльскай катастрофе і Вялікая пятніца перад праваслаўным Вялікаднем. Слоганам канцэрта стане выраз «Мір сляпы — вайна бачыць многае».

За трыццаць пяць гадоў існавання «Мінская вясна» паспела паўдзельнічаць у выхаванні многіх беларускіх, цяпер ужо сусветна вядомых, музыкантаў — віяланчэлістаў Івана Карызны і Аляксея Кісялёва, піяніста Андрэя Паначэўнага, скрыпача Арцёма Шышкова і іншых.

«У 1984 годзе я напісаў запіску міністру культуры, у якой сказаў, што, апроч Беларускай музычнай восені, па ўзоры «Пражскай вясны» і нам добра было б зрабіць вясеннюю праграму прэм'ер, аднаўленняў, тэматычных канцэртаў, — успамінае мастацкі кіраўнік філармоніі Юрый Гільдзюк. — Гэта было вельмі добра прынята. Цяпер філармонія засталася з «Мінскай вясной» сам-насам, нашы фестывалі перасталі фінансавацца асобна, і з той нагоды, што мы — бюджэтная арганізацыя, прыходзіцца ўкладвацца ў тыя рамкі, у якія прымушае ўкладвацца жыццё. Але ў нас атрымліваецца рабіць вельмі цікавыя праграмы».

Агулам юбілейны фестываль рыхтуе дванаццаць канцэртаў — дванаццаць асабліва вясенніх вечароў мінскай вясны.

**Адказная за выпуск Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**